*С. В. Паноў*
Акадэмія адукацыі, Мінск

*S. Panov*
Academy of Education, Minsk

**УДК 371**

# ГІСТОРЫКА-АНТРАПАЛАГІЧНЫ ПАДЫХОД ДА КАНСТРУЯВАННЯ ЗМЕСТУ ШКОЛЬНАЙ ГІСТАРЫЧНАЙ АДУКАЦЫІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ: СУТНАСЦЬ І РЭАЛІЗАЦЫЯ

# HISTORICAL-ANTHROPOLOGICAL APPROACH TO THE CONSTRUCTION OF THE CONTENT OF SCHOOL HISTORICAL EDUCATION IN THE REPUBLIC OF BELARUS: ESSENCE AND REALIZATION

*У артыкуле асвятляецца гісторыка-антрапалагічны падыход да канструявання зместу школьнай гістарычнай адукацыі як комплексны педагагічны сродак. Сутнасць дадзенага падыходу складае адлюстраванне працэсу развіцця чалавека ў культурна-гістарычным асяроддзі ў розныя храналагічныя перыяды. Рэалізацыя дадзенага падыходу прадвызначае прадстаўленне культурна-гістарычных узораў дзеянняў чалавека ў гісторыі як прыкладаў сацыяльных паводзін для сучасных вучняў. Прыводзяцца прыклады спалучэння фармальна-факталагічнага біяграфічнага апісання ўчынкаў гістарычных асоб з магчымасцю складання іх біяграм, якія адлюстроўваюць матывацыю паводзін у розных сітуацыях.*

*Ключавыя словы: школьная гістарычная адукацыя; гісторыка-антрапалагічны падыход; комплексны педагагічны сродак; роля чалавека ў гісторыі; культурна-гістарычныя аналагі сацыяльных паводзін.*

*The article covers the historical-anthropological approach to the construction of the content of school historical education as a complex pedagogical tool. The essence of this approach is to reflect the process of development of the person in the cultural-historical environment in different chronological periods. The implementation of this approach predetermines the presentation of cultural-historical patterns of human actions in history as examples of social behavior for modern pupils. There are examples of a combination of formal-factual biographical description of the deeds of historical persons with the possibility of compiling their biographies, which reflect the motivation of behavior in various situations.*

*Keywords: school historical education; historical-anthropological approach; complex pedagogical tool; the role of man in history, cultural-historical analogues of social behavior.*

Гісторыка-антрапалагічны падыход да канструявання зместу школьнай гістарычнай адукацыі як інстытуцыянальна-ведамаснай сістэмы адносіцца да канцэптуальных асноў яе станаўлення і развіцця ў Рэспубліцы Беларусь [1, с. 9]. Гэты падыход, будучы комплексным педагагічным сродкам, класіфікуецца як прадметна-гістарычны. Ён пры сваёй рэалізацыі прызначаны для сацыялізацыі асобы вучня ва ўмовах трансляцыі

зместу адукацыі як сацыяльнага вопыту з улікам асаблівасцей міжпакаленнай камунікацыі ў інфармацыйным грамадстве. Як адзначае доктар педагагічных навук, прафесар А. Д. Кароль, аб мінулым мы мяркуем ужо не на аснове ведаў, якія з'яўляюцца часткай культуры, а па інфармацыі, якая адлюстроўвае нашу сучаснасць, калі веды аб мінулым, гісторыі чалавека падмяняюцца кіруемымі аб'ёмамі інфармацыі [2, с. 127]. Сутнасць гісторыка-антрапалагічнага падыходу абумоўлена разуменнем антрапалогіі як сукупнасці навуковых дысцыплін, якія вывучаюць развіццё чалавека ў культурна-гістарычным асяроддзі ў розныя храналагічныя перыяды. Такая сутнасць падыходу пры яго рэалізацыі прадугледжвае дыдактычную магчымасць зместавага напаўнення вучэбных гістарычных ведаў, якія адлюстроўваюць ролю гістарычных асоб і матывацыю іх сацыяльных паводзін у розных жыццёвых сітуацыях. Гэта значыць, што ў змесце школьнай гістарычнай адукацыі прадстаўляюцца культурна-гістарычныя ўзоры сацыяльных паводзін чалавека, што ў сваім патэнцыяле спалучае як фармальна-факталагічнае біяграфічнае апісанне ролі гістарычных асоб, так і складанне іх біяграм з улікам выяўлення эмацыйна-каштоўнаснага кампанента гістарычнай персоны. Такі падыход пры сваёй рэалізацыі актуалізуе фарміраванне ў вучняў асобаснага эмацыянальна афарбаванага ўспрыняцця гістарычнага мінулага і сучаснасці.

Гісторыка-антрапалагічны падыход да канструявання зместу школьнай гістарычнай адукацыі структурна складаецца з комплексу кампанентаў. Педагагічны кампанент прадугледжвае рэалізацыю агульнапедагагічных (культуралагічнага і кампетэнтнаснага) падыходаў да падрыхтоўкі выпускніка сярэдняй агульнаадукацыйнай школы па гісторыі. Менавіта антрапалагічны кантэкст з'яўляецца вызначальным у сучасных адукацыйных практыках, бо апелюе к эмоцыям і асабістым перакананням вучняў [2, с. 13–16]. Сацыяльны кампанент падыходу актуалізаваны функцыяй пераемнасці гістарычных падзей і працэсаў, дзейнасці выдатных асоб у працэсе захавання і трансляцыі калектыўнай гістарычнай памяці. Асабовы кампанент прадугледжвае арыентаванасць падыходу на фарміраванне ў вучняў вопыту творчай дзейнасці і эмацыянальна-каштоўнасных адносін да засваення зместу адукацыі, які суадносіцца з універсальнымі кампетэнцыямі крэатыўнасці і эмацыянальнай рэгуляцыі. Гістарычны кампанент падыходу абумоўлены ажыццяўленнем ў Рэспубліцы Беларусь дзяржаўнай гістарычнай палітыкі, якая накіравана на замацаванне беларускай нацыянальнай канцэпцыі гістарычнага мінулага і беларускай мадэлі гістарычнай памяці. Зместавы кампанент падыходу накіраваны, у прыватнасці, на рэалізацыю вучэбным прадметам «Гісторыя Беларусі» нацыястваральнай ролі, якая абумоўлена фарміраваннем у вучняў каштоўнасці дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь. Аксіялагічны кампанент падыходу ўлічвае сістэму каштоўнасных арыентацый сучаснага беларускага грамадства ў якасці праксеалагічных крытэрыяў адбору зместу школьнай гістарычнай адукацыі, неабходнага для вызначэння вучнямі маральных арыентыраў сваіх сацыяльных паводзін.

Вызначэнне гісторыка-антрапалагічнага падыходу да канструявання зместу школьнай гістарычнай адукацыі як метадалагічнага належыць расійскаму даследчыку, доктару педагагічных навук, прафесару В. Ю. Стрэлавай. Яна азначае, што гэты падыход адлюстроўвае прысутнасць чалавека ў гістарычных падзеях пры раскрыцці яго інтарэсаў і імкненняў, каштоўнасных арыентыраў і матываў паводзін [3, с. 51]. Носьбітамі каштоўнасных адносін у змесце вучэбнай літаратуры па гісторыі выступаюць як адлюстраваныя ў ёй рэальныя гістарычныя персанажы (героі) мінулага і сучаснасці, так і сам аўтар, які адбірае адпаведную яго перакананням інфармацыю, а таксама настаўнік і вучні як суб'екты адукацыйнага працэсу [4, с. 67–68].

Грунтоўнай навукова-метадычнай распрацоўкай расійскага вучонага-дыдакта Л. М. Алексашкінай у рэалізацыі аспекта «асоба ў гісторыі» з'яўляецца вывучэнне эвалюцыі прадстаўлення чалавека ў школьных падручніках па гісторыі з акцэнтацыяй на індывідуальную (персаналізаваную) гісторыю [5]. Доктарам гістарычных навук, прафесарам У. Н. Сідарцовым прапанаваны тры намінацыі прадстаўлення дзейнасці гістарычных асоб: гісторыя ў асобах; гісторыя праз асобу; асоба ў гісторыі [6, с. 157–158]. Гісторыя ў асобах прадвызначае тых ці іншых гістарычных дзеячаў, якія пакінулі прыкметны след у сучасны ім перыяд гістарычнага развіцця для стварэння яго цэласнай карціны. Гісторыя праз асобу азначае апісанне гістарычнага працэсу з уключэннем у яго наратыў асоб, дзейнасць якіх найболей паказальная для таго гістарычнага часу, у якім яны жылі. Намінацыя «Асоба ў гісторыі» арыентавана на раскрыццё ролі асобы ў сучасным ёй сацыяльным жыцці з вызначэннем і тлумачэннем укладу дадзенай асобы ў грамадскае развіццё.

Асвятленне ролі асобы ў гісторыі звязана з праблематыкай фарміравання вобраза чалавека, што традыцыйна прадстаўлена ў вучэбнай гістарычнай літаратуры праз пералік біяграфічных даных гістарычных асоб ці ўвогуле пералічэнне іх прозвішчаў. Біяграма, у адрозненне ад звычайнай біяграфіі, утрымоўвае апісанне дзейнасці асобы з вызначэннем матываў яе паводзін і характарыстыкай яе эмацыянальнага стану. Стварэнне біяграм дазваляе рэалізоўваць адну са зместавых ліній адукацыйнага стандарту агульнай сярэдняй адукацыі па гісторыі «Чалавек у гісторыі». Такая зместавая лінія дазваляе, вобразна кажучы, «ачалавечыць» гісторыю з канцэптуалізацыяй суб'ектнасці прадстаўнікоў беларускай нацыі (ураджэнцаў Беларусі) праз вызначэнне матываў іх дзеянняў і характарыстыку эмацыйна-каштоўнаснай сферы асобы.

Прыкладам уласнай біяграмы з'яляюцца ўспаміны доктара гістарычных навук, прафесара У. Н. Сідарцова аб жыцці на акупіраванай у 1941 г. германскімі захопнікамі тэрыторыі Гомельшчыны [1, с. 213–214]. У. Н. Сідарцову на той момант было толькі 6 гадоў, але яго дзіцячыя перажыванні аказаліся настолькі моцнымі, што абумовілі дарослую пазіцыю недапушчэння вайны як сродку знішчэння людзей. Знаходжанне ў сітуацыі пагрозы жыццю яго маці спалучаецца ва ўспамінах з адносінамі да яго нямецкага афіцэра,

які ўбачыў у ім вобраз свайго сына і зрабіў фотаздымак. Успаміны адлюстроўваюць пазіцыю яго аўтара, накіраваную на захаванне гістарычнай памяці беларускага народа аб Вялікай Айчыннай вайне і рэалізацыю гістарычнай памяццю яе кансалідацыйнай функцыі.

Гісторыка-антрапалагічны падыход да канструявання зместу школьнай гістарычнай адукацыі рэалізаваны аўтарам артыкула ў некалькіх пакаленнях школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі. З улікам гэтага вопыту прадстаўлены вынікі праведзенага ім анкетавання адносін настаўнікаў да ролі асобы ў гісторыі Беларусі навейшага часу. Так, напрыклад, больш за 90 % настаўнікаў станоўча вызначыліся адносна такіх дзеячаў, як партызанскі камандзір М. Ф. Шмыроў (бацька Мінай), партыйны кіраўнік у БССР П. М. Машэраў, народныя пісьменнікі Беларусі В. У. Быкаў, У. С. Караткевіч, І. П. Мележ, народны мастак Беларусі М. А. Савіцкі. Больш за 60 % рэспандэнтаў адзначылі, што дзве асобы (П. М. Машэраў, В. У. Быкаў) заслугоўваюць быць у пантэоне нацыянальных герояў Беларусі [7, с. 6–7].

Адным з метадычных сродкаў рэалізацыі гісторыка-антрапалагічнага падыходу з’яўляецца, напрыклад, прыём актуалізацыі гістарычнага мінулага з апорай на сучаснасць. Ён выкарыстаны ў вучэбным дапаможніку па гісторыі Беларусі 1917 г. – пачатку XXI ст. для 9-га класа (Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2019) пры характарыстыцы ўраджэнца Сенненшчыны наводчыка танкавай гарматы Андрэя Усава. Пры абароне Ленінграда ў жніўні 1941 г. А. Усаў у адным баі снайперскім агнём асабіста падбіў 22 варожых танка. У тым баі танкавым экіпажам камандаваў Зіновій Калабанаў. У пасляваенны час ён служыў у Беларусі, а пасля звальнення з войска жыў у Мінску і працаваў на аўтамабільным заводзе. Адна з самых прэстыжных узнагарод у сучаснай камп’ютарнай гульні «World of Tanks» называецца «медалём Калабанава». Ёю ўзнагароджваецца той, хто апошнім са сваёй каманды застаецца ў жывых і атрымоўвае перамогу ў баі супраць пяці і больш танкаў саперніка.

Вобразы гістарычных асоб, умоўна кажучы, не складзіруюцца ў нейкую віртуальную галерэю партрэтаў, а абумоўліваюць магчымасць карыстацца ідэямі і вынаходніцтвамі асоб і вызначаць свае ўласныя адносіны да тактыкі і вынікаў іх дзейнасці. Як магчымасць фарміравання асабістазапатрабаваных адносін вучняў да гістарычных персаналій можа разглядацца супастаўленне імі сваёй пазіцыі з пазіцыяй удзельнікаў падзей, уменне паставіць сябе на месца іншага, выкарыстанне метадычнага прыема персаніфікацыі.

Варта заўважыць, што на аснове засваення вобразаў гістарычных асоб і іх спосабаў паводзін могуць фарміравацца асобасныя ідэалы вучняў, якія з’яўляюцца састаўной часткай іх светапогляду. Засваенне так званых культурна-гістарычных аналагаў (узораў) паводзін можа ўплываць на прыняцце вучнямі рашэнняў ва ўласнай жыццядзейнасці (сацыяльных паводзінах, міжасобаснай камунікацыі), што стварае ўмовы для сацыялізацыі асобы.

Азнаямленне вучняў з узорамі паводзін чалавека ў гістарычных сітуацыях пазіцыянуецца ў педагогіцы як аптымальны спосаб уваходжання ча-

лавека ў свет культуры праз трансляцыю сацыяльнага вопыту. Прыкладам служыць інфармацыя аб Кузьме Венядзіктавічу Кісялёве, размешчаная ў згаданым вучэбным дапаможніку па гісторыі Беларусі для 9-га класа. К. В. Кісялёў, які быў урачом па прафесіі, у 1959 г., знаходзячыся на пасадзе міністра замежных спраў БССР, выступіў на адным з пасяджэнняў у Арганізацыі Аб'яднаных Нацый з прапановай стварэння Фонда па садзеянні барацьбе з ракавымі захворваннямі. Па яго ініцыятыве ў Мінску пачалося будаўніцтва анкалагічнага шпіталя. Аднак у сувязі з недахопам сродкаў яно было згорнута. Тады К. В. Кісялёў вырашыў выкарыстаць сваё выступленне ў ААН для таго, каб звярнуць увагу на праблему барацьбы з анкалогіяй. У сваім выступленні ён паведаміў пра паспяховае будаўніцтва шпіталя ў Мінску і запрасіў Генеральнага сакратара ААН наведаць рэспубліку з візітам, каб той асабіста мог ацаніць унёсак БССР у агульную справу барацьбы з адным з самых каварных захворванняў чалавецтва. Выступленне К. В. Кісялёва стала вынікам яго асабістай ініцыятывы і не ўзгадніў з вышэйшым кіраўніцтвам. Аднак яно дасягнула сваёй мэты – будаўніцтва анкалагічнага шпіталя было адноўлена. Аднак К. В. Кісялёва знялі з пасады намесніка старшыні Савета Міністраў БССР. Паводле ўспамінаў яго дзяцей, калі бацька, пасля таго як быў пазбаўлены пасады, прыехаў з Масквы дамоў, ён паклікаў іх і сказаў: «Дзеці, пасады прыходзяць і сыходзяць, а бальніцы застаюцца». Словы К. В. Кісялёва служаць сінтагмай – кароткім сэнсаваўтаваральным сказам, што служыць інструментам рэалізацыі гісторыка-антрапалагічнага падыходу.

Такім чынам, сутнасць гісторыка-антрапалагічнага падыходу заключаецца ў адлюстраванні праз змест школьнай гістарычнай адукацыі жыцця і сацыяльных паводзін чалавека ў розным культурна-гістарычным асяроддзі, якое канкрэтызуецца склаўшыміся абставінамі і ўчынкамі гістарычных персон. Рэалізацыя гісторыка-антрапалагічнага падыходу ў працэсе трансляцыі зместу школьнай гістарычнай адукацыі прадугледжвае раскрыццё ролі асобы ў гісторыі з вызначэннем персаналій, якія пакінулі памяць аб сябе дзякуючы сваім прафесійным і грамадскім здзяйсненням, творчасці, жыццёвай пазіцыі, паводзінам. Рэалізацыя прынцыпу антрапалагізацыі ў навучанні абумоўлівае засваенне зместу школьнай гістарычнай адукацыі пры асвятленні дзейнасці нашых суайчыннікаў і равеснікаў вучняў па іх узросту ў гістарычным і сучасным грамадска-палітычным, сацыяльна-культурным асяроддзі з улікам матывацыйнага кампаненту асобы. Працэс трансляцыі ўзораў сацыяльных норм паводзін, запатрабаваных вучнямі з пазіцыі традыцыйных каштоўнасцей, дазваляе актывізаваць эмацыйна-каштоўнасную сферу асобы праз актуалізацыю яе асобаснага жыццёвага вопыту. Пры гэтым рэалізацыя гісторыка-антрапалагічнага падыходу спалучаецца з гісторыка-аксіялагічным як агульнапедагагічнымі, бо каштоўнасныя арыентацыі з'яўляюцца матывамі паводзін чалавека ў гісторыі і могуць быць выкарыстаны ў якасці маральных узораў паводзін (культурна-гістарычных аналагаў). Рэалізацыя прынцыпу культурна-гістарычнага асяроддзя разам

з прынцыпам антрапалагізацыі прадугледжвае трансляцыю і засваенне вучнямі дасягненняў прадстаўнікоў беларускай нацыі ў галіне матэрыяльнай і духоўнай культуры, а таксама ідэй (думак) і каштоўнасных арыентацый чалавека ў гісторыі з вызначэннем пераемнасці з сучаснасцю. Пры гэтым актуалізуецца нацыятворчы патэнцыял вучэбнага прадмета «Гісторыя Беларусі», засваенне зместу якога ўплывае на фарміраванне ідэнтычнасці вучняў як ураджэнцаў Беларусі і грамадзян Рэспублікі Беларусь.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Паноў, С. В.* Канцэптуальныя асновы развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь / С. В. Паноў. – Мінск: Нацыянальны інстытут адукацыі, 2023. – 272 с.

2. *Король, А. Д.* Образование для Человека. От скорости к ценности / А. Д. Король, Е. А. Бушманова. – Минск: Аверсэв, 2024. – 190 с.

3. *Вяземский, Е. Е.* Календарь образовательных событий и воспитание культуры памяти российских школьников как актуальная задача педагогов / Е. Е. Вяземский, О. Ю. Стрелова // Преподавание истории в школе. – 2020. – № 8. – С. 45–53.

4. *Стрелова, О. Ю.* Воспитание историей как формирование ценностей личности / О. Ю. Стрелова // Преподавание истории и обществознания в школе. – 2003. – № 7. – С. 66–70.

5. *Алексашкина, Л. Н.* Мир истории в биографиях и портретах: пособие для учителя / Л. Н. Алексашкина. – М.: ООО «Русское слово – учебник», 2022. – 144 с.

6. *Сидорцов, В. Н.* Изучение личности в истории: ориентация на контент-анализ, психоанализ, дискурс-анализ / В. Н. Сидорцов, А. А. Приборович. – Минск: Изд. центр БГУ, 2011. – 199 с.

7. *Паноў, С. В.* Школьная гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь: фарміраванне нацыянальна-культурнага і аксіялагічнага зместу навучання сродкамі вучэбнага прадмета «Гісторыя Беларусі» / С. В. Паноў // Веснік адукацыі. – 2023. – № 6. – С. 5–11.


**(Дата подачи: 01.02.2024 г.)**